ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

№ 6 (1039) | ЧАЦВЕР, 27 сакавіка 2003 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## М.В. СЕЛЬКІН – РЭКТАР ГДУ НА НОВЫ ТЭРМІН



**11-га сакавіка ў нашым універсітэце адбылося пасяджэнне Савета рэктараў ВНУ Гомельскай вобласці, на якім ключавым пытаннем было абмеркаванне стану і перспектыў падрыхтоўкі педагагічных кадраў на Гомельшчыне. З дакладам выступіў начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкама А.В. Лук'яновіч. Як было адзначана, наш рэгіён на 70 % забяспечваецца педагагічнымі кадрамі, якія рыхтуюць у ГДУ і Мазырскім пед-універсітэце. Разам з тым дэмаграфічныя працэсы, што адбываюцца сёння ў грамадстве, патрабуюць карэкціроўкі падыходаў да планавання падрыхтоўкі кадраў за кошт бюджэтных сродкаў, каб захаваць тэрытарыяльны баланс выпуску маладых спецыялістаў і патрэбы ў іх.**

**У абмеркаванні пытання прыняў удзел начальнік Галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь А.А. Пыжоў. Яго прыезд у г. Гомель быў звязаны таксама з выкананнем ганаровага даручэння: ён зачытаў на Савеце рэктараў загад міністра адукацыі рэспублікі аб назначэнні рэктарам ГДУ імя Ф. Скарыны на новы 5-гадовы тэрмін д.ф-м.н., прафесара М.В. Селькіна. А.А. Пыжоў шчыра павіншаваў Міхаіла Васільевіча з гэтай падзеяй, да яго слоў віншавання далучыліся таксама нам. старшыні аблвыканкама В.А. Кляблееў, усе члены Савета рэктараў ВНУ Гомельскай вобласці. Яны пажадалі М.В. Селькіну далейшай плённай працы на адказнай пасадзе кіраўніка вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся.**

***

**У гэты ж дзень адбыўся сход працоўнага калектыву ГДУ, на якім была аб'яўлена навіна аб новым прызначэнні М.В. Селькіна. Ад імя ўсяго калектыву універсітэта яго цёпла і сардэчна павіншавалі з гэтай нагоды старшыня прафкама студэнтаў Н.І. Колтышава і нам. старшыні прафкама Т.А. Валчкова.**

**М. В. Селькін выступіў на сходзе з дакладам аб жыццядзейнасці універсітэта ў перыяд з 2000 па 2002 гг. і акрэсліў задачы, якія стаяць перад ГДУ на бліжэйшы перыяд.**

### (З ДАКЛАДА НА СХОДЗЕ ПРАЦОЎНАГА КАЛЕКТЫВУ)

Ва універсітэце – 12 факультэтаў, 49 кафедр, якія рыхтуюць кадры па 24 спецыяльнасцях і 58 спецыялізацыях, а таксама 17 структурных падраздзяленняў.

На баланс універсітэта перададзены будынак былога кінатэатра "Юбілейны" пад вучэбна-культурны комплекс.

Ва універсітэце ёсць 390 персанальных камп'ютэраў. За 2000-2002 гг. іх набыта 190. Функцыянуе 12 камп'ютэрных класаў. Створана карпаратыўная лакальная сетка, спадарожнікавы комплекс для работы ў сетцы Internet.

Бібліятэка універсітэта адносіцца да першай групы бібліятэк, у яе фондзе – звыш за 1 млн. экземпляраў. Ёсць у ГДУ неабходная выдавецкая база і паліграфічнае абсталяванне.

Колькасць працуючага персаналу – 1296 чал., у тым ліку ПВС – 588 чалавек, сярод якіх – 31 доктар і 219 кандыдатаў навук. На разглядзе ў ВАК Беларусі знаходзяцца 5 доктарскіх і 12 кандыдацкіх дысертацый.

Ва універсітэце працуюць 1 сапраўдны і 3 члены-карэспандэнты НАН Беларусі, 10 членаў замежных і беларускіх грамадскіх акадэмій. Сярод ганаровых дактароў ГДУ – Морыс Шэневуа (Францыя), Гаэтана Барлета (Італія), Вольфганг Гашуц (Германія), Алексій II – Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі, Фёдар Мікалаевіч Капуцкі (Беларусь), Аляксандр Андрэевіч Грамыка (Расія).

За перыяд 2000-2002 гг. праведзена вялікая работа па ўдасканальванню арганізацыі і кіравання якасцю вучэбнага працэсу. Адкрыты новыя спецыяльнасць "Інфармацыйныя тэхналогіі" і спецыялізацыі: "Літаратурная работа ў газетах і часопісах", "Новыя матэрыялы і тэхналогіі", "Геалогія і пошук нафтавых і газавых месцанараджэнняў".

Створаны дзве новыя кафедры: спартыўных дысцыплін, сацыяльнай і педагагічнай псіхалогіі. Па дзённай форме навучаецца 5627 студэнтаў, па завочнай – 2852. Студэнты 3-4 курсаў праходзяць дадатковае навучанне для атрымання акадэмічнай ступені бакалаўра.

Кіраванне і кантроль за арганізацыяй вучэбна-метадычнай работы ва універсітэце ажыццяўляецца з дапамогай падсістэм АСК: "Тарыфікацыя і кадры", "Вучэбны аддзел", "Кафедра", "Факультэт".

Асаблівая ўвага ў 2000-2002 гг. удзялялася ўдасканальванню ўнутрывузаўскага кантролю ў межсісійны перыяд; арганізацыі вучэбнага працэсу па завочнай форме навучання; выданню вучэбна-метадычных камплектаў для студэнтаў-завочнікаў; вучэбна-даследчай рабоце студэнтаў: арганізацыі і методыцы курсавога і дыпломнага праектавання; кіраванню якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў: кантролю якасці вучэбнага працэсу.

Якасць універсітэцкай адукацыі вызначаецца ўзроўнем навуковай дзейнасці. Дастаткова дынамічнае развіццё універсітэта тлумачыцца ўзятым з самага пачатку курсам на развіццё фундаментальнай навукі і цесным супрацоўніцтвам з акадэмічнымі навуковымі арганізацыямі.

Універсітэт прымае ўдзел у выкананні Дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў (46 заданняў, а з 2003 г. – 49, г. зн. найбольшая колькасць сярод ВНУ Міністэрства, за выключэннем БДУ), Міжвузаўскіх і галіновых праграм Міністэрства адукацыі (18 заданняў), Дзяржаўных і рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм (10 заданняў). Адной з асаблівасцей навуковай дзейнасці універсітэта з'яўляецца яе рэгіянальная накіраванасць. З 136 тэм, выкананых у 2002 г., 34 (25%) напрамую звязаны з вырашэннем рэгіянальных праблем.

У 2000-2002 гг. укаранёна ў вытворчасць 28 навукова-тэхнічных распрацовак. У гэты ж перыяд універсітэт выступіў ініцыятарам і арганізатарам каля 100 канферэнцый рознага ўзроўню.

За апошнія тры гады абаронена 9 доктарскіх (па тры штогод) і 50 кандыдацкіх дысертацый.

Міжнародны аўтарытэт вучоных ГДУ выяўляецца ў пашырэнні супрацоўніцтва з навуковымі арганізацыямі не толькі краін СНД (Расіі, Украіны), але і далёкага замежжа: Францыі, Германіі, Чэхіі, Швецыі, Польшчы, Фінляндыі, Кітая, Мексікі, ЗША.

Аб поспехах студэнтаў у навукова-даследчай рабоце сведчыць тое, што за 2000-2002 гг. удастоены прэмій Савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 4 студэнцкія навуковыя аб'яднанні, якімі кіруюць М.С. Далінскі, І.М. Якаўцоў, І.Ф. Штэйнер, Т.П. Жалонкіна.

**Задачы, якія стаяць перад універсітэтам на бліжэйшы перыяд.**

Неабходны мадэрнізацыя, рамонт і аптымізацыя выкарыстання існуючай матэрыяльна-тэхнічнай базы, пошукі яе абнаўлення. Функцыянаванне ГДУ павінна цесна спалучацца з рэгіянальным аспектам. Універсітэцкая адукацыя вызначаецца ўзроўнем навуковай дзейнасці. Для яе рэалізацыі неабходны: канкрэтызацыя навуковых накірункаў з абавязковай прывязкай іх да прыярытэтных па Рэспубліцы Беларусь; узмацненне прыкладной накіраванасці ў навуковых даследаваннях, актывізацыя ўдзелу ў распрацоўцы ДНТП і прыкладных даследаванняў па заказах вытворчых арганізацый і г.д.

Выхаваўчаму працэсу неабходна надаць мэтанакіраваны і наступальны характар. Усе выхаваўчыя мерапрыемствы, а таксама дзеянні структур, якія заняты ў гэтым працэсе, павінны быць накіраваны на дасягненне галоўнай мэты выхавання, якая пастаўлена ў Канцэпцыі выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь.

Вельмі актуальнай задачай міжнароднага супрацоўніцтва для ГДУ з'яўляецца выхад на больш высокі ўзровень – на выкананне праектаў, якія фінансуюцца міжнароднымі фондамі, а таксама вылучэнне ўласных распрацовак на сусветны рынак.

З мэтай павелічэння долі ўнутраных сродкаў у капітальных і бягучых расходах універсітэта неабходна пашыраць дзейнасць па аказванню платных паслуг ва ўсіх сферах.

## АБРАНЫ ДЭПУТАТАМІ

Па выніках галасавання на выбарчых участках № 23 і № 28, якія размяшчаліся ў вучэбных карпусах №1 і №2 ГДУ, дэпутатамі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў дваццаць чацвёртага склікання абраны: у Гомельскі абласны Савет па Пушкінскай выбарчай акрузе № 17 – **МАЛАХАЎ Аляксандр Уладзіміравіч**, дырэктар рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Гомельскі аўтарамонтны завод"; у гарадскі Савет па Авіяцыйнай выбарчай акрузе № 38 – **ГЛУШАКОЎ Юрый Эдуардавіч**, старшы навуковы супрацоўнік установы "Гомельскі абласны краязнаўчы музей".

Першы прарэктар нашага універсітэта **КАРМАЗІН Аляксандр Пятровіч** заваяваў дэпутацкі мандат у гарадскі Савет, у які ён вылучаўся па Хатаевіцкай выбарчай акрузе № 39. Ён набраў неабходную большасць галасоў выбаршчыкаў пасля першага тура галасавання, якое праходзіла 2-га сакавіка.

Калектыў ГДУ віншуе Аляксандра Пятровіча з абраннем яго ў органы мясцовай улады і жадае яму на справе апраўдваць аказаны яму выбаршчыкамі высокі давер.

## ПАДЗЯКА СТУДЭНТАМ

У лютым у г. Бранску праводзілася I Міжнародная спартакіяда абаронных спартыўна-тэхнічных арганізацый СНД, якая прысвячалася Дню абаронцаў Айчыны.

У ёй прымала ўдзел і каманда Гомельскай вобласці, у складзе якой выступалі студэнты нашага універсітэта: другакурснік эканомфака Сяргей Лапачоў і другакурснік факультэта фізічнай культуры Ігар Яфімаў. Яны ўнеслі свой пасільны ўклад у поспех каманды, якая заняла ў спаборніцтвах прызавое трэцяе месца.

Старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага абаронна-спартыўна-тэхнічнага таварыства А.І. Бондараў у дасланым ва універсітэт на імя рэктара М.В. Селькіна лісце выказаў шчырую падзяку названым юнакам за іх удалае выступленне на спартакіядзе

## КАБ МОВУ РОДНУЮ ЛЮБІЦЬ

Па рашэнню ЮНЕСКА нядаўна праводзіўся Міжнародны дзень матчынай мовы. З гэтай нагоды на філалагічным факультэце быў выпушчаны спецыяльны лінгвістычны бюлетэнь, а таксама сумесна з бібліятэкай арганізавана выстава навуковай, навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры па мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, гісторыі і культуры.

Выстава выклікала цікавасць у студэнтаў і выкладчыкаў.

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў факультэта фізічнай культуры горача віншуюць дэкана названага факультэта дацэнта **НАРСКІНА Генадзя Іванавіча** з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектывы кафедр беларускай мовы, гісторыі славян і спецыяльных гістарычных дысцыплін горача віншуюць **МІНАКОВУ Людмілу Мікалаеўну** і **МАКУШНІКАВА Алега Анатольевіча** з прысваеннем ім ВАКам Рэспублікі Беларусь вучонага звання дацэнта.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і ў сувязі з 65-годдзем з дня нараджэння дацэнт кафедры фізвыхавання і спорту* ***ПРАЦКО Юрый Піліпавіч*** *узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую вучэбную і выхаваўчую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і ў сувязі з 65-годдзем з дня нараджэння кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры* ***ЗАЙЦАЎ Барыс Макаравіч*** *узнагароджаны Ганаровай граматай універсітэта.*

*За шматгадовую плённую работу, добрасумленныя адносіны да сваіх службовых абавязкаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта намеснік галоўнага бухгалтара* ***АЗЯЎЧЫКАВА Ганна Уладзіміраўна*** *ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

